ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМСАМОЛЬСКАГА І ПРАФСАЮЗНЫХ КАМІТЭТАЎ БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

ГАЗЕТА ЎЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

1988 г.
ЧАЦВЕР
2
ЧЭРВЕНЯ
№ 19 (1577)

ВЫДАЕЦЦА З 1922 ГОДА

У наступным нумары чытайце

Часта яе параўноўваюць з тэатрам аднаго гледача, называючы так выкладчыка. Адзін дасціпны студэнт прапанаваў уласны трапны выраз — барацьба аднаго гладыятара — маючы на ўвазе гору падручнікаў і канспектаў, якія даводзіцца перавярнуць перад экзаменам, каб абвергнуць ісціну «адзін у полі...»

МЫ ЗГАДЗІЛІСЯ, ШТО У АДЗІНОЧКУ ДАСТОЙНА ПРАЙСЦІ ПРАЗ УСЕ ВЫПРАБАВАННІ І САПРАЎДЫ АМАЛЬ НЕМАГЧЫМА. ТАМУ ЗАМЕСТ ТРАДЫЦЫЙНАГА «СВЯТОЧНАГА» РЭПАРТАЖУ З ШЭРАГАМ КЛІЧНІКАЎ У ПАДБОРЦЫ «АД СЕСІІ ДА СЕСІІ» ПАСПРАБАВАЛІ ЗІРНУЦЬ КРЫТЫЧНЫМ ВОКАМ НА ТЫХ, ХТО ПАВІНЕН ДАПАМАГАЦЬ СТУДЭНТАМ У ЧАС СЕСІІ, АБМЕРКАВАЦЬ ПРАБЛЕМЫ ЗАВОЧНАГА НАВУЧАННЯ.

Беларускі універсітэт
ТЭЛЕТАЙП
УЧОРА · СЁННЯ · ЗАЎТРА

ВЯЛІКІЯ І СКЛАДАНЫЯ ЗАДАЧЫ

стаяць зараз перад вышэйшай школай. Перабудова ў галіне вышэйшай адукацыі — гэта перш за ўсё ўдасканаленне форм і метадаў вучэбна-выхаваўчага працэсу. Сёння мы не можам працаваць па-старому, бо гэта не адпавядае патрабаванням часу. І гэта датычыць не толькі савецкіх студэнтаў.

Штогод наш універсітэт гасцінна расчыняе дзверы для навучэнцаў, якія прыязджаюць з замежных краін. На працягу пяці гадоў мы павінны вучыць іх абранай спецыяльнасці, раскрываць таямніцы прафесіі. І наша задача не толькі даваць ім неабходныя веды, але і выхоўваць. Як зрабіць, каб вучоба і выхаванне існавалі не паасобку, а дапаўнялі адно другое, былі ўзаемазвязаны. Аб гэтым і ішла размова на пасяджэнні вучонага савета БДУ імя У. І. Леніна. З дакладам «Аб стане і мерах па далейшаму ўдасканаленню вучэбна-выхаваўчага працэсу з замежнымі навучэнцамі» выступіў прарэктар па міжнародных сувязях А. В. Шарапа.

Члены вучонага савета заслухалі паведамленне сакратара камітэта камсамола універсітэта А. Жука аб падрыхтоўцы студэнцкіх атрадаў да летняга працоўнага семестра-88.

Разгледжаны таксама арганізацыйныя пытанні.

З. МІХНЕВІЧ.

ДЭМАКРАТЫЯ Ў ДЗЕЯННІ

ЯК ВЫБІРАЛІ РЭКТАРА

— Вы задаволены выбарамі рэктара? — з такім пытаннем звярнуліся мы да нашых субяседнікаў. І атрымалі адказ:

— Безумоўна. Сёння вельмі папулярнымі сталі словы «перабудова», «дэмакратыя». Па-праўдзе кажучы, часам сумняваешся ў нейкіх пераменах вакол сябе, а тут аб'ява: «Адбудуцца выбары рэктара». Радуе, што подых перамен закрануў і нас.

І САПРАЎДЫ, гэта навіна літаральна ўскалыхнула шматтысячны калектыў універсітэта. Праўда, такіх прыкладаў па краіне шмат, калі выбіралі дырэктара завода, кіраўніка калгаса ці саўгаса. Але адна справа, калі падобнае адбываецца недзе, і зусім іншая — там, дзе ты працуеш.

СЛОВА прадастаўляецца акадэміку АН БССР Л. І. Кісялеўскаму, які ўзначаліў БДУ імя У. І. Леніна ў 1983 годзе. Перш чым спыніцца на асноўных момантах справаздачы, хочацца адзначыць, што (аб гэтым гаварылі потым і выступаючыя) была яна даволі аргументаванай і, што асабліва важна, самакрытычнай, без замоўчвання «вострых вуглоў». Л. І. Кісялеўскі не толькі расказаў аб тым, што зроблена, чаго дасягнулі, але і пазнаёміў з перспектывамі развіцця універсітэта.

Галоўная задача сёння — паскарэнне перабудовы вучэбна-выхаваўчага працэсу. І мы бачым ужо першыя рэзультаты. Гэта скарачэнне абавязковых вучэбных дысцыплін, укараненне разнастайных форм індывідуальных заняткаў пад кантролем выкладчыкаў, перагляд тэматыкі дыпломных і курсавых работ з мэтай набліжэння яе да запытаў навукі і вытворчасці. Дзейсным рычагом павышэння паспяховасці з'явілася адмена ўмоўных пераводаў студэнтаў з акадэмічнай запазычанасцю.

Вынікі зімовай сесіі сведчаць аб тым, што выкарыстанне новых форм кантролю за самастойнай работай студэнтаў, узмацненне патрабавальнасці прафесарска-выкладчыцкага саставу ў семестры садзейнічала павышэнню эфектыўнасці работы студэнтаў над вывучаемым матэрыялам. У выніку гэтага знізілася колькасць незадавальняючых адзнак і павялічылася — выдатных і добрых.

Але заспакойвацца рана. Наперадзе вялікая і напружаная работа. Асабліва гэта датычыць мэтавай падрыхтоўкі спецыялістаў на аснове прамых дагавораў з прадпрыемствамі, міністэрствамі, ведамствамі. Важна, каб гэтыя сувязі былі не эпізадычнымі, а доўгатэрміновымі, трывалымі. І асабліва значэнне ў данай справе належыць навукі. Зараз у нас працуюць тры вучэбна-навукова-вытворчыя аб'яднанні з ВА «Інтэграл», «Планар», «Гранат», а таксама НДІ ФХП — хімічны факультэт. Вядзецца падрыхтоўчая работа па стварэнню такіх аб'яднанняў з НДІ ЭВМ, МВА «Вылічальная тэхніка».

Не сакрэт, што толькі тады навуковае дасягненне будзе не дарэмным, калі дасягнута

(Заканчэнне на 2-й стар.).

ТВОЙ СУЧАСНІК



Сашу Канаша, напэўна, прадстаўляць не трэба. Яго добра ведаюць і на ФПМ, і ва універсітэце. Добры студэнт, цудоўны арганізатар, чулы і надзейны таварыш. Прыемна, што іменна такі чалавек узначальвае камсамольскую арганізацыю ФПМ, прадстаўляе інтарэсы студэнцтва ў вучоным савеце універсітэта.

СПОРТ

СІЛА І СПРЫТ

вызначалі пераможцаў гэтага віду спорту. Нездарма яго называюць цяжкай атлетыкай. На прайшоўшым першынстве ВНУ рэспублікі мацнейшымі аказаліся цяжкаатлеты інстытута фізічнай культуры, сярэбраныя прызёры — спартсмены Віцебскага педагагічнага інстытута, а каманда нашага універсітэта на трэцім месцы.

А. МАРОЗАЎ.

ТРАДЫЦЫЙНАЯ КРУГЛАГАДОВАЯ

XXXVI спартакіяда БДУ імя У. І. Леніна, якая ўключала васемнаццаць відаў спорту, закончана. Пераможцы вызначаны. Нялёгка далося першае месца юрыдычнаму факультэту, другое — у фізфака, трэцяе — у ФПМ.

М. АНДРЭЕЎ.

ДЫСКА-МАРАФОН, або Танцы за поўнач

— У колькі скончылася ўчора дыскатэка?

— Ды каля трох ночы. Я да канца не быў. Натанцаваўся і пайшоў спаць.

(З размовы ў інтэрнаце).

СПАЧАТКУ было добра знаёмае ўсім слова «нельга». З'явілася яно не само па сабе, а разам з інструкцыяй, якая дазваляла праводзіць дыскатэкі ў суботу да 23.00. І ва ўсіх інтэрнатах універсітэта рабілі (ды і зараз робяць) усё магчымае, каб інструкцыя не парушалася. Балазе, сачыць за выкананнем распарадку ёсць каму. Тут і камендант, і студсавет, і прафком. Спытаць таксама ёсць з каго. Камендант са студсавета, той, у сваю чаргу,— з жыхароў. І, здаралася, каралі жорстка. А начныя дыскатэкі на паверхах інтэрнатаў як праводзіліся, так і праводзяцца. З году ў год абмяркоўваем пытанне, як з гэтым змагацца. Дзяжурылі за поўнач каменданты, члены аператыўных атрадаў. Але як толькі ўсе лягуць спаць, дыскатэка зноў грыміць на ўсю моц.

Прыгадваю гісторыю з дзвюма сцежкамі ў двары. Адну з іх зрабілі будаўнікі, заасфальтаваўшы яе, другую, больш зручную і карацейшую, пратапталі самі жыхары. Але нехта вырашыў, што гэта непарадак, і ўскапаў апошнюю, жадаючы прымусіць людзей хадзіць па той, якая нязручная. Людзі зноў пайшлі па ўскапанаму. Тады перакапалі яшчэ раз і нават шыльдачку павесілі: «Хадзіць забараняецца». Але зноў, як і раней, на гэта мала хто звярнуў увагу. Пратаптаная сцежка засталася на ўсё жыццё. А каб яе больш не перакопвалі, узялі ды паклалі асфальт.

У нашым выпадку здарылася нешта падобнае. Раптам у інтэрнаце № 2 аб'явілі: жадаеце танцаваць да раніцы — калі ласка! Так больш месяца назад адбылася першая, зусім не падобная на ранейшыя дыскатэка. І раней, бывала, парушалі правілы, але 24 гадзіны — быў тэрмін самы позні. А тут раптоўна заява ад вядучага: «Пасля трыццаціхвілінага адпачынку жадаючых патанцаваць запрашаем на працяг нашай дыскатэкі». Яна скончылася а палове чацвёртай гадзіны ночы. Нават самыя заўзятыя танцоры не маглі паскардзіцца, што ім мала. І ўпершыню за многа гадоў у гэты суботні вечар на паверхах інтэрнатаў было ціха.

Неабходнасць у правядзенні нелегальных дыскатэк адпала. Зразумела, што такое магчыма толькі дзякуючы сумеснай зацікаўленасці студсавета і каменданта. Клопаты, праўда, узраслі. А на працягу ўсёй дыскатэкі ў зале павінен прысутнічаць аператыўны атрад і камендант. Затое няма зараз ніякіх «незвычайных здарэнняў». Я маю на ўвазе выбітыя шыбы і бойкі. А самае галоўнае, гэта яшчэ раз пацвердзіла, што толькі так і неабходна дзейнічаць: патрэбна вырашаць праблемы сумесна.

На жаль, «барадатае» правіла яшчэ дзейнічае. І нічога не варта таму ці іншаму начальніку, прачытаўшы гэты матэрыял, сказаць знаёмае «нельга». Закрыцца ім як шчытом ад усіх нашых праблем. Толькі цяпер за ім ужо не схавацца.

А. МАКСІМАЎ.

МАНАЛОГ СТАРШЫНІ

Сакрэты студсавета

Меркаванні аказаліся самымі рознымі. Дзве дзяўчыны абыякава паціснулі плячыма: «Як працуе студсавет? Мы неяк не заўважалі. Хіба што дыскатэкі праводзяцца...»

Адна са студэнтак геафака ўсміхнулася: «Што мы можам сказаць? Так далёка ўсё гэта. Мы ж ужо на пятым курсе».

Іншыя ажыўлена пералічвалі: конкурсы, сустрэчы, працоўныя дэсанты, потым нават вынайшлі недзе фарбавую афішу навагодняга вечара...

Карацей кажучы, даведацца аб тым, чым займаецца студэнцкі савет у інтэрнаце, было няпроста. Таму я звярнулася за дапамогай да старшыні студсавета інтэрната № 7 САВЕЛІЯ КУЗЬМІНА:

— А што тут расказваць? Дыскатэкі вось праводзім кожную суботу, а да свят рыхтуем конкурсы. Стварылі радыёвузел, таму з'явілася магчымасць па пятніцах і нядзелях весці перадачу «Яшчэ не вечар». Гэты абавязак узялі на сябе студэнты філфака. Што за перадача атрымалася? У ёй — віншаванні з днём нараджэння, любімыя песні па заяўках. Праўда, зараз у эфір выходзім рэдка — сесія ўсё ж.

На восьмым паверсе — турыстычны клуб. Гэта ўжо ініцыятыва геафака. Ёсць невялічкая бібліятэка, «пакой сяброў», дзе замежныя студэнты адзначаюць нацыянальныя святы, а часта прыходзяць сюды проста падзяліцца думкамі, папіць чаю.

А вось спартыўны пакой да гэтага часу ніяк не ўладкуем — складана ва універсітэце са спартыўным інвентаром. А яшчэ студсавет у нас працуе выхавацелем. Часта даводзіцца ўздзейнічаць адміністрацыйнымі мерамі. Аб'яўляем вымовы, здараецца, высяляем з інтэрната. Часцей за ўсё тых, хто забываецца на існаванне месц, адведзеных для курэння. Дапамагае падтрымліваць парадак аператыўны атрад. Камандзір яго Сяргей Бабруйскі. Вынікі? Мяркуйце самі: на навагоднім вечары было 150 чалавек гасцей — і ніводнага парушэння.

Нядаўна падводзілі вынікі сацыялістычнага спаборніцтва. Лепшымі аказаліся пакоі № 908 і № 911. Ім былі ўручаны вымпелы і каляровы тэлевізар.

Увялі на вахце сістэму сустрэчнага пропуску. Каму падабаецца, каму не. Многія скардзяцца, што гасцям даводзіцца доўга чакаць, пакуль знойдзецца ахвотнік падняцца і паклікаць патрэбнага чалавека. Сапраўды, дзяжурны ж не зможа пастаянна бегаць сюды-туды. Патрэбны ўдасканаленні.

І не толькі ў наладжванні сустрэчнай сістэмы, здаецца мне. Калі ў час размовы з жыхарамі нехта паскардзіўся: «Што гэты студсавет? Абяцалі даць стол. Пакуль для ўсіх гэта застаецца праблемай».Я прыгадала словы старшыні студсавета: «Холы ў нас няўтульныя. Вось калі б прафком дапамог раздабыць крэслы, столікі...»

Запісала М. ПЯТРОВА.

ЯК ВЫБІРАЛІ РЭКТАРА

(*Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.*).

канчатковая мэта — укараненне ў практыку. Л. І. Кісялеўскі прывёў такую лічбу: эканамічны эфект ад укаранення завершаных НДР узрос з 22 млн. рублёў да 27,5.

Аднак патэнцыяльныя магчымасці ў развіцці навукі выкарыстоўваюцца пакуль што відавочна недастаткова. Мала ўвагі ўдзяляецца рашэнню найбольш важных сучасных праблем навукова-тэхнічнага, эканамічнага і сацыяльнага прагрэсу. У нас практычна няма міжкафедральных тэм, не вельмі трывалыя сувязі з рэспубліканскімі арганізацыямі. Па многіх гаспадарчых дагаворах нізкі або наогул адсутнічае эканамічны эфект. Хацелася б, каб і нашы вучоныя-грамадазнаўцы больш актыўна ўключыліся ў распрацоўку філасофскіх, сацыяльных, эканамічных і гістарычных праблем, якія ставіць сёння жыццё, рэвалюцыйны працэс перабудовы.

У сваім выступленні Леанід Іванавіч акрэсліў таксама асноўныя моманты падрыхтоўкі спецыялістаў для замежных краін. Ён адзначыў, што рэктарат бачыць сваю задачу не толькі ў тым, каб рыхтаваць высокакваліфікаваныя кадры, але і ў тым, каб пазнаёміць замежных навучэнцаў з дасягненнямі нашай краіны ў галіне эканомікі і культуры.

Вучачыся ва універсітэце, замежныя студэнты жывуць паўнакроўным жыццём. Яны актыўна ўдзельнічаюць у навуковай рабоце (на навуковых канферэнцыях рознага ўзроўню імі было зроблена каля 200 дакладаў), мастацкай самадзейнасці, фестывалях, мітынгах салідарнасці, паліткірмашах, дыскусіях, займаюць прызавыя месцы ў спартыўных спаборніцтвах і г. д.

Важным этапам дзейнасці універсітэта з'яўляецца ўмацаванне навуковага і культурнага супрацоўніцтва з ВНУ і навуковымі цэнтрамі замежных краін. Прыемна заўважыць, што значна актывізаваўся абмен спецыялістамі для навуковай работы, стажыровак, чытання лекцый, павышэння кваліфікацыі з вышэйшымі навучальнымі ўстановамі капіталістычных краін.

Безумоўна, нельга было абысці і студэнцкае самакіраванне. Леанід Іванавіч выказаў думку, што справа гэта (хоць вельмі складаная і супярэчлівая і выклікае шмат водгукаў: станоўчых і адмоўных) патрэбная, а формы самакіравання павінны пастаянна ўдасканальвацца і расшырацца.

З асаблівай увагай слухалі члены вучонага савета пра развіццё матэрыяльна-тэхнічнай базы універсітэта. У 1983 годзе БДУ знаходзіўся ў вельмі цяжкім матэрыяльным становішчы і практычна не меў рэальнай праграмы свайго развіцця. Будаўніцтва было ў поўным сэнсе слова «замарожана». Немалых намаганняў каштавала асваенне універсітэтам у пяцігадовы перыяд больш 8 млн. рублёў капіталаўкладанняў. Многія аб'екты ўжо ўступілі ў строй, некаторыя плануецца здаць у канцы гэтага года (напрыклад, будынак вучэбна-спартыўнага корпуса з басейнам і спартыўнымі залямі).

Да 1996 года запланавана пабудаваць васемнаццаць і рэканструяваць два універсітэцкія аб'екты на суму больш 110 млн. рублёў. Увойдуць сем вучэбных і вучэбна-лабараторных карпусоў, два будынкі НДІ і г. д. Будуць уводзіцца і аб'екты сацыяльна-бытавога назначэння — тры інтэрнаты для студэнтаў і аспірантаў, два жылыя дамы, пансіянат, аздараўленча-спартыўны і піянерскі лагеры, сталовая. На 1990 год запланаваны і пачатак будаўніцтва галоўнага корпуса БДУ імя У. І. Леніна.

Але не трэба думаць, што ажыццяўленне намечаных планаў залежыць толькі ад будаўнікоў і выдзяляемых сродкаў. Гэта меркаванне памылковае. Немалаважнае значэнне адыгрывае і тое, з якой энергіяй падключымся да гэтай работы мы, як будзем аказваць будаўнікам дапамогу (маюцца на ўвазе студэнцкія будаўнічыя атрады, работа на суботніках). Каб выканаць усё гэта «трэба», рэктарату неабходна павысіць эфектыўнасць сваёй работы, зрабіць яе больш паслядоўнай і мэтанакіраванай.

Так, прыкласці рукі сапраўды ёсць да чаго. Да сённяшняга дня не ўдалося дабіцца, напрыклад, паляпшэння ўмоў працы на філалагічным факультэце, ФПМ і факультэце журналістыкі, забеспячэнне вучэбнамі карпусамі якіх не вытрымлівае ніякай крытыкі. Па-ранейшаму недастатковым з'яўляецца тэхнічнае аснашчэнне вучэбнага працэсу і ўзровень камп'ютэрызацыі.

Тэма многіх нашых спрэчак і дыскусій — выкладанне дысцыплін на беларускай мове. Тут, скажам прама, існуюць палярныя пункты гледжання. Але, думаецца, не трэба кідацца ў крайнасці, бо гэта ніколі яшчэ не прыносіла поспеху ніякай справе. Добра было б, каб лекцыі на беларускай мове чыталіся не толькі па гісторыі БССР, а і некаторых іншых прадметах, прычым не толькі гуманітарнага профілю.

Карацей, праблем шмат і даволі сур'ёзных. Надышоў час ушчыльную заняцца іх вырашэннем.

«Я ГАЛАСУЮ «ЗА»

Пры абмеркаванні кандыдатуры рэктара выступілі студэнты, супрацоўнікі, выкладчыкі. Амаль усе адзначалі, што мы не часта прысутнічаем на такіх мерапрыемствах. За ўсю гісторыю універсітэта такое адбываецца ўпершыню. Прычым выбары рэктара праводзяцца ў складаны і адказны для вышэйшай школы час.

Сёння прымаецца шмат пастаноў, якія накіраваны на перабудову вышэйшай адукацыі. Але калі не будзе наладжаны пастаянны кантроль за іх выкананнем, воз не толькі сёння, але і заўтра застанецца на месцы, а нашы намаганні будуць выстралам ўхаластую. Зразумела, многае залежыць ад кіраўніка. Загадчык кафедры гісторыі філасофіі і логікі А. А. Міхайлаў у сваім выступленні выказаў спадзяванне, што, выбраўшы рэктарам БДУ акадэміка Л. І. Кісялеўскага, мы зможам ажыццявіць перабудову вышэйшай адукацыі.

— Адразу хачу пачуць адказ на пытанне, якое хвалюе мяне ўжо не адзін дзень, а гады. Як вы лічыце, гэта нармальная з'ява, калі прафесар філфака дае кансультацыю студэнту з Марока ў раздзявалцы? — паставіў пытанне рубам дэкан філалагічнага факультэта А. А. Волк.— Я думаю, такое недапушчальна. У выступленні Леаніда Іванавіча прагучала, што праз пяць гадоў мы атрымаем такія доўгачаканыя плошчы. Гэта добра, але яны патрэбны зараз, сёння. Аб якой жа, скажыце, якасці ведаў мы можам гаварыць? Мяркую, гэта пытанне патрэбна вырашаць неадкладна.

Так (шчыра, адкрыта, прынцыпова) гучалі і выступленні іншых членаў вучонага савета. Яны выказвалі набалелае, дзяліліся думкамі, раіліся,і кожны з іх быў упэўнены, што пытанне будзе абавязкова абмеркавана, прымуцца неабходныя меры.

— Сёння вельмі адчуваюцца перамены да лепшага. Ва ўсіх сферах дзейнасці чалавека выпрацоўваюцца і ўкараняюцца дэмакратычныя формы кіраўніцтва. Скажу па шчырасці, я не ведаю больш дэмакратычнага чалавека, чым Леанід Іванавіч,— гэта думка дырэктара НДІ ПФП А. Ф. Чарняўскага.— Але непакоіць мяне вось што: няма ў нас зялёнага святла моладзі. Часта перастраховываемся, што не атрымаецца або атрымаецца не так. А не трэба гэтага баяцца. Не памыляецца той, хто нічога не робіць. Мы выхоўваем маладое пакаленне, і чаму б яму не браць прыклад з маладых настаўнікаў.

Выступаючыя адзначылі станоўчыя рысы Л. І. Кісялеўскага як вучонага, педагога, кіраўніка, а таксама чыста чалавечыя якасці. Гэта ўменне выслухаць субяседніка, параіць, дапамагчы. Ён ніколі не навязвае сваю думку, не лічыць яе адзіна правільнай, але калі ўпэўнены ў сваёй праваце, можа тактоўна пераканаць у правільнасці свайго пункту гледжання.

— З Леанідам Іванавічам працаваць лёгка, цікава. Да яго можна прыходзіць з любымі прапановамі і заўсёды мець гарантыю таго, што цябе выслухаюць, дапамогуць, ініцыятыву — падтрымаюць, ідэю — абмяркуюць, — вось лейтматыў выступленняў дэкана хімфака В. Ф. Цікавага, загадчыка кафедры факультэта радыёфізікі і электронікі І. А. Малевіча, студэнта юрфака Ю. Слепача, загадчыка кафедры фізфака У. П. Гольцава, дырэктара СКТБ з доследнай вытворчасцю М. І. Акімава, выкладчыка кафедры гісторыі партыі, Героя Савецкага Саюза, прафесара Д. П. Жмуроўскага, сакратара камітэта камсамола БДУ А. Жука, дэкана фізфака В. А. Гайсёнка, сакратара парткома М. І. Юрчука.— Мы галасуем «за», бо ўпэўнены, вялікія задачы, пастаўленыя перад вышэйшай адукацыяй сёння, Л. І. Кісялеўскаму пад сілу.

Такой жа думкі акадэмік АН БССР М. А. Ельяшэвіч, які быццам перагарнуў старонкі біяграфіі Л. І. Кісялеўскага, пазнаёміў з асноўнымі вехамі яго дзейнасці.

І вось самы напружаны момант — галасаванне. Хваляванне і на здавалася б зусім спакойным твары рэктара.

...Галасы падлічаны. «За» — 146, «супраць» — 9 (адзін бюлетэнь несапраўдны). Як кажуць, большасцю галасоў рэктарам БДУ імя У. І. Леніна зноў выбраны акадэмік АН БССР Л. І. Кісялеўскі.

Нам таксама застаецца толькі павіншаваць Леаніда Іванавіча з аказаным яму вялікім даверам — быць «у руля» флагмана вышэйшай школы рэспублікі.

З. АЛЯШКЕВІЧ.

РЭПАРТАЖ У НУМАР

МЫ ЗЫЧЫМ ВАМ ПОСПЕХАЎ





ЛЯ ДЗВЯРЭЙ, за якімі ідзе прыём дакументаў на аддзяленні завочнага факультэта (сёння ён ужо закончаны), — натоўп. Разглядаю твары: да каго б звярнуцца з пытаннем? Спыняюся на адным: прыгожым і на дзіва спакойным.

Знаёмлюся: Макарэвіч Эліна Уладзіміраўна — настаўніца СШ № 120 горада Мінска. І... дзіўнае супадзенне. Аказваецца, Эліна — калега, журналіст па адукацыі. Закончыла журфак (вячэрняе аддзяленне) пяць гадоў назад.

— Сёння я не магу дакладна сказаць, чаму «памяняла» прафесію. На журфак пайшла адразу пасля школы. Але, напэўна, недастаткова добра ведала, што чакае мяне, калі звяжу свой лёс з журналістыкай. Мне здаецца, каб стаць добрым журналістам (я маю на ўвазе жанчыну), патрэбна ад нечага адмовіцца. А мне вельмі не хацелася б гэтага. Тым больш, што ў нас расце сын, якому, як і любая маці, я гатова аддаць усё. Няхай гэта не будзе гучна сказана, але каб выхаваць яго сапраўдным чалавекам, патрэбна шмат сіл і часу. Я зразумела, што апошняга якраз і не будзе хапаць. Затое зараз я магу займацца сынам, гуляць з ім, доўга размаўляць, спрачацца. І пры гэтым нічым не ахвярую.

У школу (як гэта часта здараецца) я трапіла выпадкова: проста, каб вучыцца на вячэрнім, патрэбна было недзе працаваць. Пайшла ў школу і ўжо зусім ніколі не думала, што так палюблю дзяцей. З імі я магу дзяліцца радасцямі і непрыемнасцямі, раіцца, проста гутарыць.

Чаму спакойная? Ну, па-першае, гэта не ўступныя экзамены. Па-другое, я не буду здаваць іх.

Вам не зусім зразумела? Тлумачу: Эліна ўжо мае вышэйшую гуманітарную адукацыю і на пасяджэнні прыёмнай камісіі будзе вырашана, на які курс яе залічыць: на другі ці на трэці (гэта залежыць ад колькасці прадметаў, якія яна даздасць).

Зусім іншы лёс у Ігара Рэпкіна. Ужо амаль тры гады ён працуе судовым выканаўцам Гомельскага раённага суда. Некалькі разоў спрабаваў паступаць на юрфак, але заўсёды яму не шанцавала. Толькі ўпартасць, настойлівасць, улюбёнасць ў сваю прафесію зноў і зноў прымушаюць яго адчыняць дзверы БДУ і спрабаваць шчасця. Сёлета ён вырашыў паступаць на завочны факультэт на аддзяленне правазнаўства.

— А калі не паступіш?

— Буду спрабаваць зноў.

— Магчыма, ёсць сэнс падаць дакументы на іншае аддзяленне, дзе меншы конкурс?

— Не, іншае мяне не задавальняе.

— Чаму ж?

— Вы ведаеце, што такое быць шчаслівым? Калі чалавеку хочацца спяваць? Дык вось я і хачу прыносіць чалавеку радасць, абараняць яго ад зла, несправядлівасці.

Так, коратка і пераканаўча, адказаў на мае пытанні Ігар.

Што ж, пажадаем яму поспехаў і здзяйснення мары, да якой ён ідзе такой нялёгкай дарогай, але не здраджвае, не пасуе перад цяжкасцямі.

А іх наперадзе сапраўды шмат. Аб гэтым у нас размова з намеснікам адказнага сакратара прыёмнай камісіі Г. В. Мацвеевым.

— *У гэтым годзе мы будзем весці прыём экзаменаў на завочным факультэце на васьмі аддзяленнях,— расказвае Генадзь Васільевіч.— Трэба адзначыць, што сёлета (не ведаю, што сыграла дамініруючую ролю: прафесійная арыентацыя ці звычайнае жаданне атрымаць дыплом аб вышэйшай адукацыі) павялічыўся наплыў абітурыентаў да нас. Гэта, безумоўна, добра, бо дзякуючы павелічэнню конкурсу мы зможам правесці больш якасны адбор.*

— Якія аддзяленні карыстаюцца асаблівай папулярнасцю?

— *Як заўсёды — аддзяленні правазнаўства, гісторыі і біялогіі (на іх падаюцца найбольшая колькасць заяў). Мяркую, лягчэй паступіць на аддзяленне журналістыкі, бо конкурс будзе невысокі. Напэўна, нашых абітурыентаў пужае творчы конкурс, які праводзіцца перад уступнымі экзаменамі.*

— Генадзь Васільевіч, каму аддаецца перавага ў час прыёму дакументаў, ці ёсць, напрыклад, якое-небудзь размежаванне паміж горадам і вёскай і г. д.

— *Тут ніякіх абмежаванняў няма. Толькі пры залічэнні ўлічваецца стаж работы па спецыяльнасці. Разам са стажнікамі ў першую чаргу прымаюцца звольненыя ў запас ваеннаслужачыя і выпускнікі тэхнікумаў. Усе астатнія — на агульных умовах. Так што мы зычым вам поспехаў, шаноўныя абітурыенты!*

Магчыма, у той час, калі ты, паважаны чытач, будзеш праглядаць гэтыя радкі, некаторыя з маіх субяседнікаў, напэўна, атрымаюць першыя адзнакі ў атэстацыйныя лісты. Я б хацела, каб яны былі толькі выдатнымі і прынеслі ўпэўненасць у сваіх магчымасцях, бо гэта самае галоўнае ў жыцці.

З. АЛЯКСАНДРАВА.
ФОТА С. ПЛЫТКЕВІЧА.

І яшчэ раз самастойнасць

ЯКІМ павінен быць сённяшні школьны настаўнік? Перш за ўсё чалавекам у вышэйшай ступені адукаваным, іменна адукаваным, а не проста навучаным. Калі навучанне разумець як працэс перадачы гатовых ведаў, то гэта толькі адзін з этапаў адукацыі, якую патрэбна разглядаць як працэс развіцця ўсіх здольнасцей чалавека на базе засваення таго багацця ведаў, якое назапашана чалавецтвам. Адукаванасць — гэта перш за ўсё здольнасць творча разумець запыты свайго часу, пастаянная гатоўнасць працаваць над сабой.

ЦІ СТВОРАНЫ ва універсітэце і ў прыватнасці на хімічным факультэце магчымасці для фарміравання адукаванага, сучаснага выкладчыка хіміі? Тут адразу трэба адзначыць: сфарміраваць высококваліфікаванага спецыяліста нельга без жадання студэнта стаць такім. Факультэт можа толькі стварыць адпаведныя ўмовы, даць магчымасці. Рэалізацыя ж гэтых магчымасцей залежыць ад студэнтаў.

Педагагічны калектыў факультэта ставіць перад сабой двуадзіную задачу: даць будучым настаўнікам хіміі не толькі глыбокую спецыяльную фізіка-хімічную падрыхтоўку, але і прафесійна-педагагічную. Прычым апошняя рэалізуецца як у працэсе вывучэння дысцыплін псіхолага-педагагічнага цыкла, так і ў ходзе вучэбнага працэсу па ўсіх асноўных хімічных дысцыплінах. Выкладчыкі факультэта імкнуцца да таго, каб студэнты не толькі ў курсах педагогікі і методыкі выкладання хіміі знаёміліся з тым, як патрэбна будаваць урок, дабівацца засваення вывучаемага матэрыялу, актывізаваць пазнавальную дзейнасць навучэнцаў, але і бачылі гэта ў канкрэтнай дзейнасці сваіх педагогаў, будучы непасрэднымі ўдзельнікамі працэсу навучання.

Практычна ацэньваючы метадычныя прыёмы, якія выкарыстоўваюць выкладчыкі факультэта, будучыя педагогі адбіраюць для сваёй прафесійнай дзейнасці ўсё тое лепшае, з чым яны сустракаюцца.

Плануючы змест адукацыі будучых настаўнікаў, кожная кафедра факультэта ўлічвае элементы прафесійнай арыентацыі студэнтаў. Напрыклад, у розных хімічных курсах на педагагічным аддзяленні факультэта выкладчыкі імкнуцца засяроджваць увагу студэнтаў на методыцы разгледжання канкрэтных пытанняў, на фармуліроўках, вызначэннях, асабліва тых, якія выкарыстоўваюцца ў школьных курсах і адносна якіх існуюць розныя пункты гледжання. У лабараторныя практыкумы ўводзяцца элементы дэманстрацыйнага эксперыменту, звяртаецца ўвага студэнтаў на тэхніку выканання розных хімічных аперацый.

Адной з важнейшых задач вучэбнага працэсу на факультэце з'яўляецца фарміраванне ў студэнтаў вопыту работы па самаадукацыі. Відавочна, што любая ВНУ не можа ўзброіць студэнтаў ведамі, якіх было б дастаткова на ўсю далейшую прафесійную дзейнасць. Таму ў працэсе навучання студэнты павінны набыць навыкі самастойнага папаўнення сваіх ведаў, творчага падыходу да вырашэння розных пытанняў як вузка прафесійных, так і грамадска-арганізацыйных. Арганізацыя розных відаў самастойнай работы па хімічных дысцыплінах, прыцягненне студэнтаў да навуковадаследчай работы ў яе розных формах (СНТ, курсавыя, дыпломныя праекты) накіравана не толькі на набыццё канкрэтных хімічных ведаў будучымі спецыялістамі, але і на фарміраванне ў іх навыкаў самастойнай творчай работы, без якіх не можа быць сапраўднага спецыяліста, а настаўніка тым больш.

Важнай складанай часткай падрыхтоўкі настаўнікаў з'яўляецца іх педагагічная практыка. Факультэт падтрымлівае цесныя сувязі з многімі школамі горада, дзе працуюць кваліфікаваныя настаўнікі хіміі, якія заўсёды гатовы дзяліцца сваім вопытам работы са студэнтамі. Пры арганізацыі бесперапыннай педагагічнай практыкі ў працэсе вучобы на першых трох курсах сустракаюцца пэўныя цяжкасці. І галоўная з іх — недахоп у студэнтаў часу для работы ў школе. Дрэнна ўплывае на якасць практыкі і перагружанасць некаторых школ студэнтамі. Але патрэбна адзначыць і тое, што тыя студэнты, якія хочуць набыць пэўны вопыт работы са школьнікамі, прафесійныя навыкі, знаходзяць магчымасць для работы ў школе пад кіраўніцтвам вопытных метадыстаў і настаўнікаў хіміі. Фарміраванню прафесійных навыкаў педагогаў садзейнічае правядзенне практычных заняткаў па методыцы выкладання хіміі ў форме дзелавых гульняў, падрыхтоўка студэнтамі курсавых і дыпломных работ па педагагічнай тэматыцы.

На наш погляд, будучыя педагогі ў час вучобы ва універсітэце павінны больш увагі ўдзяляць павышэнню свайго агульнакультурнага ўзроўню. У гэтым плане могуць быць карыснымі заняткі на ФГП, удзел у грамадскай рабоце, чытанне мастацкай літаратуры з абмеркаваннем прачытанага з сябрамі і выкладчыкамі і г. д. На жаль, актыўнасць большасці студэнтаў у сэнсе павышэння свайго агульнаадукацыйнага і прафесійнага ўзроўню невялікая, што часта тлумачыцца занятасцю сваім асноўным прадметам — хіміяй. А часцей за ўсё гэта звязана з няўменнем рацыянальна планаваць свой рабочы час і выкарыстоўваць яго максімальна эфектыўна. Вось гэтаму і стараемся мы вучыць сваіх студэнтаў з першага курса, калі ў рамках прадмета «Уводзіны ў спецыяльнасць» знаёмім іх з псіхалагічнымі аспектамі і культурай разумовай працы, з логікай арганізацыі і правядзення ўсяго вучэбнага працэсу. Словам, для студэнтаў, якія мараць стаць добрымі настаўнікамі, ствараюцца ўсе ўмовы для набыцця прафесійных навыкаў. Выкарыстанне гэтых магчымасцей — у руках студэнтаў.

Т. КАРАТАЕВА,
намеснік дэкана хімічнага факультэта.

СПАБОРНІЦТВЫ ДЛЯ СПАНІЭЛЯЎ



У суботу ўсе гаспадары «вяльможных» сабак спадзяваліся, што Гідраметцэнтр, сканцэнтраваўшы волю сотні прагназістаў, разгоніць усе хмары ў радыусе дзесяткаў кіламетраў. А наступнай раніцай нешматлікія пасажыры першых трамваяў былі вельмі здзіўлены, убачыўшы на вуліцах горада самых розных сабак, безумоўна, побач з суправаджаючымі. «На стадыён!» — басілі догі. «На стадыён!» — пагаджаліся з імі таксы. «На «Дынама»! — адзначыла нейкая асабліва дасведчаная балонка, седзячы на руках гаспадыні. Мой пёс нічога не сказаў. Ён не любіў гэтыя шумныя зборышчы, хоць і быў уладальнікам двух радоў медалёў.

...Навокал, як і заўсёды, на сапраўднай урачыстасці, мітусіліся фота- і кінарэпарцёры. І было на што глядзець: веліканы і малышы, дабракі і злоснікі, махнатыя, кучаравыя, стрыжаныя... Вочы разбягаліся!

Паклоннікі сілы і спрыту напружана сачылі за работай

аўчарак, якія без цяжкасцей бралі бар'еры і ліха затрымлівалі «злачынцаў». Аматары вострых адчуванняў маглі назіраць паядынкі тэр'ераў. Быў на выстаўцы, між ішым, і знешне забаўны бультэр'ер, прыроджаны баец і гладыятар.

Без стомы захапляліся афганскімі борзымі, французскімі бульдогамі, даўгавухімі кокер-спаніэлямі з добрымі і журботнымі вачыма.



У многіх узнікла пытанне: «За што ж атрымліваюць медалі?». Адказваю: даюць іх не толькі за прыгожыя зубы і стандартныя габарыты, але і за характар. Калі вясёлы і добры пудзель раптам забурчыць на суддзю ці нават паспрабуе яго ўкусіць, не бачыць псу ўзнагароды.

Нярэдка разважаюць так: «Навошта сабаку гэтыя выстаўкі і дыпломы? Дастаткова з ім гуляць, карміць і любіць яго». Толькі гэта ж сапраўднае свята.

А што рабіць дварнягам, у якіх няма радавітых продкаў? Няўжо не наканавана ім горда прайсціся перад трыбунай, пабліскваючы медалём? Аб гэтым лепш за ўсё раскажуць самі дварнягі — члены клуба «Дружок». А я лічу гэта залішнім, бо іх медалі гавораць самі за сябе.

Фота А. МАКСІМАВА.

...Побач перапуджана туліцца да ног гаспадыні маладзенькая спаніэлька. Гэта яе першы выхад «у свет». А колькі годнасці ў кожным руху ярка-вогненнага коллі! Адразу відаць, што прывык ён атрымліваць перамогі над сэрцамі экспертаў. Па-сяброўску махнуўшы хвастом, лізнуў ён перапуджаную спаніэльку ў нос, быццам бы падбадзёрваючы: «У добры шлях, будучая «зорка»!»

Свята набліжалася да канца. Радасныя ўладальнікі медалёў і прызоў пакідалі стадыён. Мой пёс таксама аказаўся сярод пераможцаў, хаця лічыцца ўжо ветэранам.

М. ПАПОВА,
наш няштатны карэспандэнт.



І ЎЗЫХОДЗЯЦЬ «ЗОРКІ»?

Быццам ажылі фрэскі піраміды Хеопса. Старажытнаегіпецкія жрыцы танцуюць пад акампанемент... электронных інструментаў. Гэта — «Бенглз», рок-група, якая складаецца з адных жанчын, англічанак і амерыканак, што выконваюць песню «Паходка, як у егіпцяніна». Іменна яе назвалі самай папулярнай у мінулым годзе вядучыя ўсіх амерыканскіх радыё- і тэлепраграм. І зрабілі яны гэта, абапіраючыся на даныя ўнікальнага сацыялагічнага даследавання, якім з'яўляецца хіт-парад.

У канцы кожнага тыдня на тэлетайпных стужках буйнейшых агенцтваў свету з'яўляюцца доўгія спісы папулярных мелодый. Гэта — хіт-парад, або, як называюць яго самі аўтары — «Top ten», гэта значыць лепшая дзесятка. У канцы месяца спісы павялічваюцца — гэта «Top twenty», г. зн. дваццатка лепшых хітаў месяца і ў канцы года «Top hundred» — сто найбольш папулярных спевакоў і пласцінак.

Дзякуючы хіт-парадам можна выявіць найбольш модны сёння музычны стыль, прагназіраваць тэндэнцыі ў развіцці музыкі. Асноўны хіт-парад, на які арыентуюцца амерыканскія дыск-жакеі, вядучыя музычных радыё- і тэлепраграм,— гэта апытанне, што праводзіць штотыднёвік «Білбаард».

У адрозненне ад сенсацыйных калямузычных часопісаў гэта выданне ўпаўне сур'ёзнае і аўтарытэтнае. Спісы найбольш папулярных выканаўцаў рэдактары «Білбаарда» складаюць на аснове даных аб продажы пласцінак. Таму першыя тры месяцы ў амерыканскім хіт-парадзе — гэта самыя шматтыражныя альбомы тыдня, месяца або года. Для бізнесменаў хіт-парад — гэта своеасаблівая гульня, латарэя, якую па азарту можна параўнаць толькі з рулеткай або скачкамі. Рэгулярна вывучаючы хіт-парад, вопытны дзялок здабывае для сябе процьму карыснай інфармацыі: на якім месцы стаяў той ці іншы дыск на мінулым тыдні, колькі часу знаходзіцца альбом у спісах, наколькі даўгавечны яго поспех.

Развіццё тэхнікі прынесла з сабой новы від музычных хіт-парадаў — апытанне папулярнасці відэакліпаў, якое таксама рыхтуе «Білбаард».

ТАСС.

ПРАПАНУЕМ ЗВЯРНУЦЦА

Электронны сторож

НАБЛІЖАЕЦЦА час летняга адпачынку. У кожнай сям'і зараней абмяркоўваецца месца яго правядзення. І (асабліва, калі плануецца паездка за горад, на турбазы, у пансіянаты, дамы адпачынку) часта паўстае пытанне: «На каго пакінуць кватэру?». Сторажам можа быць... адна са служб міліцыі — пазаведамасная ахова. Як жа змогуць яны захаваць маёмасць шматлікіх кватэр, якія на лета застаюцца без гаспадароў? — задумаецеся вы. Але не здзіўляйцеся, бо стэрэатып стоража тут не да месца. Вашу кватэру не будзе вартаваць нехта (звычайна гэта пажылы чалавек з ружжом). Тут дапаможа электроніка.

Выкарыстанне сродкаў аўтаматыкі і электронікі дазволіла павысіць надзейнасць аховы. Доказам гэтага з'яўляюцца факты папярэджання крадзяжу іменна дзякуючы электронным памочнікам і словы ўдзячнасці, якія гавораць гаспадары кватэр у адрас пазаведамаснай аховы.

Асабліва лёгка заключыць дагавор на ахову тым, хто мае кватэрны тэлефон. У гэтым выпадку пазаведамасная ахова бярэ на сябе абавязацельствы забяспечыць захаванне маёмасці ў любы час сутак. У выпадку крадзяжу (што здараецца вельмі рэдка) урон кампенсуецца на заключаную суму.

Вас, безумоўна, ужо зацікавіў кошт гэтай паслугі. Пры ацэнцы маёмасці на суму да трох тысяч рублёў (гэта робіцца самім уладальнікам) штомесячная аплата складае 4 рублі (пры спараным тэлефоне — 4 руб. 50 кап.). Пасля года аховы аплата зніжаецца на адзін рубель.

Ахова асабістай маёмасці інвалідаў і ўдзельнікаў грамадзянскай і Вялікай Айчыннай войнаў складае 2 руб. 50 кап. (пры ацэнцы маёмасці да 2 тыс. руб.). За кожную наступную тысячу рублёў ацэнкі маёмасці звыш вышэйупамянутых сум бярэцца дадатковая плата — адзін рубель у месяц.

З заявамі на ўстаноўку сігналізацыі патрэбна звяртацца ў аддзелы пазаведамаснай аховы пры РАУС г. Мінска (адрас Маскоўскага аддзела — вул. Грушаўская, 119, тэлефоны 25-37-12, 25-15-15, 25-58-38, 25-36-70). Жыхары іншых раёнаў горада атрымаюць неабходную інфармацыю па тэлефоне 34-87-50.

М. ГРЫНКЕВІЧ,
намеснік начальніка АПА пры АУС Маскоўскага гарвыканкома г. Мінска.

Вывучайце і ведайце сігналы апавяшчэння грамадзянскай абароны

Да сігналаў апавяшчэння грамадзянскай абароны адносяцца: «Паветраная трывога», «Адбой паветранай трывогі», «Радыяцыйная небяспека», «Хімічная трывога».

1. Сігнал «Паветраная трывога» падаецца ў выпадку непасрэднай пагрозы нападзення праціўніка. У горадзе ўключаюцца сірэны. Адначасова перадаецца па радыё: «Увага! Увага! Грамадзяне! Паветраная трывога!»

Сігнал паўтараецца на працягу 2—3 мінут. Калі сігнал застаў вас дома, адразу ж выключыце награвальныя прыборы, газ, электрапрыборы, апраніце дзяцей, не забудзьце сродкі індывідуальнай аховы (процівагаз, ватна-марлевую павязку, аптэчку, перавязачны пакет), дакументы, неабходныя рэчы, прадукты харчавання, ваду, выключыце асвятленне і хутка ідзіце ў сховішча. Па магчымасці папярэдзьце суседзяў.

II. Сігнал «Адбой паветранай трывогі» падаецца па радыётрансляцыйнай сетцы, праз радыё і тэлевізійныя станцыі, а таксама з дапамогай перасоўных гучнагаварыцельных установак.

Па гэтаму сігналу насельніцтва з дазволу старэйшых па ўкрыццю пакідае іх.

III. Сігнал «Радыяцыйная небяспека» падаецца пры непасрэднай пагрозе ці выяўленні радыёактыўнага заражэння з дапамогай усіх сродкаў сувязі і апавяшчэння.

Пачуўшы сігнал, надзеньце распіратар (ватна-марлевую павязку) ці процівагаз, не забудзьце прадукты харчавання і ваду, медыкаменты, прадметы першай неабходнасці і ідзіце ў сховішча, а калі іх паблізу няма — хавайцеся ў падвалах, каменных пабудовах.

IV. Сігнал «Хімічная трывога» падаецца пры пагрозе ці выяўленні хімічнага або бактэрыялагічнага заражэння. Па гэтаму сігналу хутка надзеньце процівагаз, верхнюю вопратку з матэрыялу тыпу «балонне», гумавыя боты, пальчаткі і схавайцеся ў сховішча, а калі іх паблізу няма, то ў жылых дамах і вытворчых памяшканнях.

V. Пра пачатак эвакуацыі рабочым, служачым і членам іх сем'яў аб'яўляе адміністрацыя прадпрыемстваў, арганізацый. Астатняе насельніцтва апавяшчаецца адміністрацыяй ЖЭС.

Пры эвакуацыі вазьміце з сабой сродкі індывідуальнай аховы, з рэчаў — толькі самае неабходнае. Трэба мець запас прадуктаў харчавання, якія не патрабуюць прыгатаўлення. Усё гэта палажыце ў рукзак, павесьце на ім бірку са сваім прозвішчам, адрасам і месцам эвакуацыі.

Не забудзьце дакументы! Кватэру зачыніце, ключы здайце ў ЖЭС і адпраўляйцеся на пункт збору, дзе вас зарэгіструюць і пакажуць транспарт ці калону, у якой вам прыйдзецца ехаць у пункт прызначэння.

Мясцовасць, куды вам прыйдзецца эвакуіравацца, і парадак эвакуацыі вам абавязаны паведаміць па месцы работы.



КАМАНДЗІР, ГРУПА, ДЫСЦЫПЛІНА...

«Зірні, месяц, як гузік...»
«Знік, як штаны з плоту...»
Я прыслухоўваюся, запамінаю.

Наша турыстычная група толькі-толькі размясцілася ў вагоне. Мерна адстукваюць колы, праплываюць пакуль што добра знаёмыя мясціны. Яшчэ некалькі гадзін назад мы былі рабочымі, таваразнаўцамі, інжынерамі, урачамі. А зараз хуткі цягнік адвозіць нас далей і далей ад Мінска. Мы знаёмімся.

Яшчэ не адчуваем сябе пасапраўднаму турыстамі, яшчэ плечы не баляць ад лямак рэчмяшка, яшчэ не гулялі на перавале ў хованкі з завірухай, але ў гаворцы толькі і чуецца: Каўказ, Крым, Алтай, Карпаты і часцей за ўсё — Цянь-Шань. Іменна туды ляжыць наш шлях. Цянь-Шань — мы адкідваем прэч наша звычайнае жыццё. Цянь-Шань — уяўляем сабе казачнай прыгажосці горы, свавольныя рачулкі і бялюткі зіхатлівы снег. Мы жывём прадчуваннем паходу. Дзіўны і прыемны гэты стан і чаканне нечага новага і незвычайнага.

ВЫПРАБАВАННЕ

«Чымган»: кавалак асфальтавай дарогі, некалькі высотных будынкаў, горы і... расчараванне. Мы стаім ля турыстычнай базы, чакаем камандзіра, пазіраем на гэтыя, як нам здавалася, невялікія горачкі. Чамусьці думаецца: «Вось табе і Цянь-Шань...».

— Наперад!— Саша Левін паказваецца з дзверы кантрольна-выратавальнай службы. Рукзакі рашуча заваёўваюць сабе месца на плячах, мы, як «цёшча» на прымака, кідаем на іх касыя позіркі, але нічога не зробіш — самі хацелі такой «жаніцьбы». Першы перавал. Некатэгарыйны нават. А ногі чамусьці не хочуць перастаўляцца. З рэчмяшком таксама нелады — з «перавалам» аказаўся, ніяк не хоча прылегчы акуратненька і па магчымасці не надакучаць. І кроплі поту, як вінаградзіны. Ну і адпачынак, думаем, злуёмся на сябе і на сваю слабасць, а перад вачыма толькі вібрамы таварыша. Краявід дык краявід.

А камандзір наперадзе выбірае дарогу. Паспрабаваў у адным месцы — пасунулася зямля і каменне, павярнуў правей, пакарабкаўся па грэбню. Страшнавата, з абодвух бакоў крутыя схілы, група глядзіць яму ўслед, ён спыняецца:

— Ліза, за мной! Коля, падстрахоўваеш!

— Можа ў другім месцы паспрабуем?

— Там не падымемся.

Ліза нерашуча падыходзіць да крутога грэбня, робіць некалькі крокаў уверх. Праз хвіліну яна ўжо паўзе на карачках. Коля Каінаў крыху ніжэй. Мы чакаем, выглядаем больш палогі схіл.

— Саша, давай я лявей паспрабую.

— Не!

Ліза засела: ні ўверх, ні ўніз. Коля раскінуў рукі, прыціснуўся да грэбня.

Таня Сцяшэнка пачынае падымацца лявей.

— Назад!

Таня незадаволена пазірае на камандзіра, але спыняецца. Ліза з Колем усё яшчэ на схіле. А сонца весела назірае за нашымі мучэннямі, здаецца, так і хоча насмешліва запытаць: «Ну, дык як, зусім маленькія горы? Яны падабаюцца вам?» Нам не да жартаў, не да любавання прыгажосцю. Як бы выбрацца адсюль.

— Спускацца!

Коля паслухмяна выконвае каманду. Ліза марудзіць. Да седлавіны метраў пятнаццаць, але зараз яна знаходзіцца як на тупым лязо нажа: справа і злева схілы такія, што і ўявіць немагчыма, што будзе з табою, калі туды пакоцішся.

Зверху чуецца:

— Ліза, кідай рукзак!

Я не вытрымліваю, падымаюся да яе.

— Сяргей, назад!

Але ўжо позна. Я побач з Лізай. Група пазірае знізу. Камандзір паўтарае:

— Ліза, кідай рукзак!

Далёка ўнізе пачынаецца невялічкая рачулка і па схіле да яе пасунуўся рукзак. Спачатку павольна, але раптоўна ён, зачапіўшыся за камень, перакуліўся і панёсся... панёсся. Разам з пяском, з каменнямі. А потым мы з Лізай высякалі ступенькі і крок за крокам самі спускаліся ўніз. І ўжо ў даліне рамонтнік перавязваў «пакалечаны» рукзак, днявальныя гатавалі абед, а камандзір аб'яўляў мне вымову за недысцыплінаванасць. Мы, нарэшце, адчулі, што першае выпрабаванне ўсё ж вытрымалі. Вытрымалі, хоць для многіх гэта быў першы пад'ём у жыцці.

(Працяг будзе).

С. ПЛЫТКЕВІЧ.
Фота аўтара.

НА ЗДЫМКАХ:
* «Ісці ланцужком, адзін за адным!».
* Напарадзе — перавал.
* «Дай руку, сябар»
* Як цудоўна адпачыць на прывале!
* Размова tet-a-tet.

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Цана 2 кап.
Мінская паліграфічная фабрыка «Чырвоная зорка» МВПА імя Я. Коласа.
2 чэрвеня
Зак. 1625.

220080, Мінск-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ВУЛ. БАБРУЙСКАЯ, 9, ПАВЕРХ 4, ПАКОІ 74-75.
ТЭЛЕФОН 20-68-27.

В. а. рэдактара
М.Г. ЗАГОРСКАЯ.